

«ЛЯСНЫЯ» ПОМНІКІ 8

ЗАЯВА «З КАНАПЫ» 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

28 СТУДЗЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 18 (29898)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«На сёння інвестыцыі ў асноўны капітал разглядаюцца як крыніца росту эканомікі. Ставіцца задача забяспечыць іх прырост на 21,2 працэнта. У суме яны павінны быць павялічаны да Br5 млрд. Сфарміраваны і зацверджаны пералік інвестыцыйных праектаў агульным аб'ёмам інвестыцый больш як на 900 млн рублёў. Нягледзячы на амбіцыйнасць планаў, за два гады інвестыцыі прырастуць толькі на чатыры працэнты. Таму задача — нарасціць і напоўніць тое, што мы ўпусцілі летась. На жаль, шмат хто ў рэгіёнах не бачыць інвестыцый. Хоць па жыллі іх аб'ём мы павялічылі практычна на Br1 млрд, па інфраструктуры — на Br3,9 млрд. Таму мы дамовіліся, што на працягу двух тыдняў выстройваем інвестыцыйныя будаўнічыя планы і праводзім іх абарону ў рэгіёнах».*

# Служыць вялікай мэце

*Дзеячам навукі, работнікам навукова-даследчых інстытутаў і ўстаноў вышэйшай адукацыі*

Дарагія сябры!

Віншую вас з Днём беларускай навукі.

Навука — падмурак дзяржаўнасці. У авангардзе развіцця цывілізацый, краін і народаў заўсёды стаялі людзі незвычайнага розуму, высокага інтэлекту і надзвычайнай працавітасці.

Быць сапраўдным навукоўцам — значыць глядзець за гарызонт, адкрываючы людзям новыя перспектывы і магчымасці, ствараючы навуковыя школы, перадаючы вопыт і веды сваім шматлікім вучням і паслядоўнікам.

У Год міру і стварэння на навуку ўскладаецца вялізная адказнасць. І прамысловасці, і сельскай гаспадаркі, і сацыяльнай сферы патрэбны прарыўныя інавацыйныя ідэі і распрацоўкі. Дзяржава, якая стварыла айчынным вучоным дастойныя ўмовы для даследчай і практычнай работы, мае права разлічваць на выключную адданасць нацыянальным інтарэсам.

Перакананы, што, служачы вялікай мэце — стварэнню ў імя міру, вы зробіце свой важкі ўнёсак ва ўмацаванне гуманітарнай бяспекі і забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту нашай краіны.

Доўгіх вам творчых гадоў, моцнага здароўя, новых навуковых здзяйсненняў у імя будучыні роднай Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



**Удзельнік выставы «Беларусь інтэлектуальная» Іван ЛЕЎЧАНКА працуе начальнікам сектара рэгістрацыі лекавых сродкаў і фармаканагляду на прадпрыемстве «Унітэхпрам БДУ». На выставе малады вучоны прадстаўляе медыцынскую распрацоўку — гідрагель біяпатыту. Яго можна будзе выкарыстоўваць у сківічна-тваравай хірургіі для злучэння і гаення невялікіх участкаў пашкоджанай касцявой тканкі.**

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Каля 55 твораў мастака Валерыя Шкарубы прадстаўляць на выставе ў Мінску.
- **Памёр легендарны форвард мінскага «Дынама» Міхаіл Мустыгін.**
- «Белавія» ўвайшла ў лідары па пунктуальнасці сярод авіякампаній па версіі аэрапорта Кальцова.
- **Саюзы пісьменнікаў Беларусі і Расіі ініцыявалі заснаванне літаратурнай прэміі «Буйніцкае поле».**
- Расія завяршыла ратыфікацыю пагаднення з Беларуссю аб узаемным прызнанні віз.

Размова па сутнасці

# НА ВЯРШЫНІ «ДАСЛЕДЧАГА АЛІМПУ»

## Кіраўнік НАН Уладзімір ГУСАКОЎ — пра тэхналагічную незалежнасць і фінансавую эфектыўнасць

**Апошнім часам навука сутыкаецца са шматлікімі новымі выклікамі: пандэмія, змяненне клімату, якое цягне змяненне ўмоў вядзення сельскай гаспадаркі, санкцыйны ціск на эканоміку. Сусветная эканоміка становіцца іншай. Адбываецца разбурэнне існуючага светапарадку, абвастрэнне супрацьстаяння паміж найбуйнейшымі эканомікамі. Сёння на першы план выходзіць праблематыка стварэння бяспекі, у тым ліку гуманітарнай. Пра тое, як акадэмічным вучоным удаецца трымаць руку на пульсе, старшыня прэзідыума акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ расказаў у інтэрв'ю журналісту «Звязды».**

СТАР. 4-5



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 — 763X